**24.** Дадзены ўстойлівыя спалучэнні:

*1) як мокрае гарыць; 2) кінуць слова; 3) праводзіць вачыма.*

Як замяніць кожнае з іх адным словам?

Выберыце патрэбныя варыянты: *а) аглядаць; б) марудна; в) сказаць*.

**А)** 1-б, 2-а, 3-в. **Б)** 1-б, 2-в, 3-а. **В)** 1-а, 2-б, 3-в.
**Г)** 1-в, 2-а, 3-б. **Д)** 1-в, 2-б, 3-а.

**25.** Дадзены сказ:

*Сцяжынку перабягаў ручай, які цурчаў з-пад маладой алешыны, што ўзнімалася над чаротам.*

Вызначце від сказа.

**А)** просты двухсастаўны сказ.
**Б)** просты двухсастаўны сказ, ускладнены пабочным сказам.
**В)** бяззлучнікавы складаны сказ.
**Г)** складаназлучаны сказ.
**Д)** складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі.

**26.** У якім годзе была створана Акадэмія навук Беларусі?

**А)** у 1724 г. **Б)** у 1870 г. **В)** у 1919 г. **Г)** у 1929 г. **Д)** у 1947 г.

**27.** У 50-я гады ХХ стагоддзя бібліёграф, літаратуразнавец, заслужаны дзеяч культуры Беларусі пачала скрупулёзна займацца даследаваннем жыцця і творчасці М. Багдановіча. Гэта – … .

**А)** Н. Ватацы. **Б)** Ю. Бібіла. **В)** З. Верас. **Г)** Т. Мазур. **Д)** Л. Ялоўчык.

**28.** У некаторых народных казках можна сустрэць выслоўе:

*“Хоць і ростам невялік, ды рука з пудавік”.*

Як вядома, пуд – мера вагі, і роўная яна – … .

**А)** 10 кг. **Б)** 16,38 кг. **В)** 25,57 кг. **Г)** 50 кг. **Д)** 100 кг.

**29.** Вядомы класік беларускай літаратуры пражыў у Гродне амаль 30 гадоў. Многія свае вядомыя творы народны пісьменнік Беларусі напісаў менавіта ў гэтым горадзе. Пра каго ідзе размова?

**А)** пра В. Быкава. **Б)** пра Р. Барадуліна. **В)** пра Н. Гілевіча.
**Г)** пра І. Шамякіна. **Д)** пра М. Танка.

**30.** Ракаў – старажытнае мястэчка, якое здаўна славілася гандлярамі і рамеснікамі. А яшчэ гэта радзіма братоў-пісьменнікаў Казіміра і Мар’яна Здзяхоўскіх. Дарэчы, Мар’ян Здзяхоўскі нават быў карэспандэнтам Л. М. Талстога, шмат друкаваўся на рускай мове пад псеўданімам … .

**А)** Я. Нёманскі. **Б)** М. Арол. **В)** М. Багун.
**Г)** М. Урсін. **Д)** Я. Крывічанін.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 20. Тыраж 13500 экз. г. Мінск. 2018 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2018»

*Чацвер, 15 лютага 2018 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1,5-2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Адгадайце народную загадку:

*Сам вада і па вадзе плавае.*

**А)** карабель. **Б)** ліст. **В)** лёд. **Г)** ветразь. **Д)** плыт.

**2.** Колькі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку ўжыта ў сказе?

*Стаяла тая пара, калі ў зялёны летні колер восень паволі пачынае ўплятаць свае жоўтыя ніткі (А. Кудравец).*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**3.** Выберыце правільна напісаны дзеяслоў у форме 2-ой асобы множнага ліку.

**А)** пацвярджаеце. **Б)** пацвярджаіце. **В)** пацвярджаяце.
**Г)** падцвярджаеце. **Д)** падцвярджаяце.

**4.** Вучні атрымалі заданне запісаць словы з раздзяляльным мяккім знакам (*ь*). Мікіта запісаў *цьмяны, віць*; Ігнат – *ледзьве, дзьмухавец*; Кацярына – *льецца, медальён*; Маруся – *парцьера, льдзіна*. Хто з вучняў правільна запісаў словы?

**А)** усе вучні. **Б)** толькі Кацярына. **В)** Мікіта, Ігнат.
**Г)** Ігнат, Кацярына. **Д)** Кацярына, Маруся.

**5.** Якія словы з дадзеных неабходна пісаць разам?

*1) кіна(тэатр); 2) усходне(славянскі); 3) усё(перамажны); 4) аўта(парк).*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**6.** Выберыце правільна напісаныя словы.

*1) студэнства; 2) пясчота; 3) Жанна; 4) птаства.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**7.** Прадоўжыце народнае выслоўе:

*Дружная праца – крыніца … .*

**А)** вады. **Б)** спрэчак. **В)** дыскусіі. **Г)** багацця. **Д)** беднасці.

**8.** Паводле структурнага складу лічэбнікі *сорак сем, дзве трэція* адносяцца да … . Выберыце правільны варыянт.

*1) простых лічэбнікаў; 2) складаных лічэбнікаў; 3) састаўных лічэбнікаў.*

**А)** няма патрэбнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 2, 3.

**9.** Дадзены словазлучэнні:

*1) аўтобусн.. дэпо; 2) маршрутн.. таксі;*
*3) прыгож..пано; 4) нов.. шасэ.*

У якіх прыметніках з прыкладаў патрэбна напісаць канчатак ***-ая***?

**А)** ва ўсіх прыметніках. **Б)** няма такіх прыметнікаў.
**В)** ва ўсіх, акрамя 1. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 4.

**10.** Вызначце правільна напісаныя адпаведнікі рускім словам *библиотека, рацион, официант*.

**А)** бібліатэка, рацыон, афіцыант. **Б)** бібліятэка, рацыён, афіцыянт.
**В)** бібліятэка, рацыён, афіцыант. **Г)** бібліатэка, рацыён, афіцэант.
**Д)** бібліятэка, рацыон, афіцыянт.

**11.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце літару ***а***?

*1) гл..таць; 2) с..рдэчны; 3) р..дактар; 4) віш..нька; 5) ябл..ня.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 4. **Д)** у 3, 5.

**12.** Якое слова з’яўляецца тэматычна лішнім у радзе?

*Прыпяць, Шчара, Нёман, Магілёў, Вілія.*

**А)** Прыпяць. **Б)** Шчара. **В)** Нёман. **Г)** Магілёў. **Д)** Вілія.

**13.** Выберыце правільна напісаныя словы.

*1) скарастны; 2) постны; 3) жаластлівы; 4) міласэрдны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**14.** Якія словазлучэнні з дадзеных напісаны правільна?

*1) чалавечнае жыццё; 2) эфектыўныя сродкі;*
*3) кваліфікацыйны работнік; 4) ёдзісты раствор; 5) гліністы посуд.*

**А)** усе словазлучэнні. **Б)** няма патрэбных словазлучэнняў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**15.** Выберыце з прапанаваных толькі назоўнікі ніякага роду.

*1) фламінга; 2) апліке; 3) дынама; 4) поні.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма патрэбных назоўнікаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**16.** Дапоўніце народную прыкмету: *“Кастрычнік зямлю балоціць, а лес …”.*

**А)** непагодзіць. **Б)** серабрыць. **В)** забывае. **Г)** залоціць. **Д)** абыходзіць.

**17.** Дадзены пачаткі народных выслоўяў:

*1) Вось на свеце як бывае: …; 2) Старога паважай, …;*
*3) Сябра шукай, а … ; 4) Не лятай высока, бо … .*

Суаднясіце іх з другой часткай:

*а) малога навучай; б) нізка сядзеш;*
*в) знойдзеш – беражы; г) хто працуе, той і мае.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-г, 2-а, 3-в, 4-б. **В)** 1-б, 2-г, 3-а, 4-в.
**Г)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а. **Д)** 1-а, 2-в, 3-г, 4-б.

**18.** Якія з дадзеных слоў напісаны правільна?

*1) дрэва апрацоўчы; 2) асабліва адказны;*
*3) вечназялёны; 4) густа населены.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**19.** Выберыце з дадзеных правільна напісаны(-ыя) сказ(-ы).

*1) Марына выступіла на канферэнцыі даволі эфектыўна.*
*2) Гэтак жа эфектна ў архітэктуры выкарыстанне новых тэхналогій.*
*3) Артыст эфектна сыграў у спектаклі ролю мастака.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** 1. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

**20.** *Раздзел мовазнаўства – навука, якая вывучае ўстойлівыя спалучэнні,* называецца … .

**А)** археалогія. **Б)** гісторыя. **В)** марфалогія.
**Г)** фразеалогія. **Д)** астраномія.

**21.** Хто з’яўляецца аўтарам радкоў?

*Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы*
*Росквітам княства Літоўскага, нашага краю,*
*І называюць той век залатым.*

**А)** Мікола Гусоўскі. **Б)** Францыск Скарына. **В)** Уладзімір Караткевіч.
**Г)** Уладзімір Арлоў. **Д)** Максім Багдановіч.

**22.** Якое слова прапушчана ў вершаваных радках П. Панчанкі?

*Лечыцца трава ад спёкі …,*
*Людзі ласкай лечацца людской.*

**А)** кветкамі. **Б)** зёлкамі. **В)** прымаразкам. **Г)** ліўнем. **Д)** маланкай.

**23.** *Аздоба пераплёту рукапісных і друкаваных кніг* – гэта … .

**А)** абрус. **Б)** абклад. **В)** рамка. **Г)** паспарту. **Д)** акант.